**ПРА ШТО КАЖУЦЬ ВЫНІКІ ЗІМОВАЙ СЕСІІ?**
Тлумачыць начальнік Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці Алена ДАСТАНКА
Стар. 2

**БІЯФАК 3.0**
Пра стратэгічныя кірункі развіцця біялагічнага факультэта распавёў новы дэкан Вадзім ДЗЯМІДЧЫК
Стар. 3

**ЗАСНАВАЛЬНІКАМ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА…**
Выйшла другая кніга серыі «БДУ: 100 гадоў на карысць Айчыны»
Стар. 4–5

**ЯК ПАДРЫХТАВАЦЬ РЭДКАГА СПЕЦЫЯЛІСТА?**
Вольга ПРАКАПЧУК у праекце «Новы погляд»
Стар. 6

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

29 сакавіка 2019 года, № 5 (2211)

## Універсітэты, грамадства і будучыня чалавецтва



Дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у працы міжнароднага форуму «Універсітэты, грамадства і будучыня чалавецтва». Праходзіла мерапрыемства ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава.



Узначаліў прадстаўніцтва беларускай ВНУ рэктар **Андрэй Кароль.** Удзельнікамі форуму таксама сталі больш за 1000 рэктараў вядучых расійскіх і замежных універсітэтаў, прадстаўнікоў навуковых арганізацый, інавацыйных кампаній і органаў дзяржаўнага кіравання. На канферэнцыі абмяркоўвалася пытанне ролі ўніверсітэтаў у гармнізацыі глабальнай навукова-адукацыйнай, тэхналагічнай і гуманітарнай прасторы. З дакладам «Метадалогія, змест і практыка крэатыўнай адукацыі ва ўніверсітэце XXI стагоддзя: эўрыстычны кампанент» выступіў рэктар БДУ Андрэй Кароль. Прапанаваная практыка арыентавана на падрыхтоўку паспяховага і запатрабаванага выпускніка. Сёння актуальныя індывідуалізацыя працэсу падрыхтоўкі студэнтаў, стварэнне ўмоў для раскрыцця творчага патэнцыялу навучэнцаў, уменне ставіць мэты, прымаць рашэнні там, дзе няма загадзя вядомых шаблонаў і выпікаў.

Праграма візіту дэлегацыі БДУ ў Маскву ўключала таксама ўдзел у працы ***XIV з'езда Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў*** (ЕАУ). Сёлета яго правядзенне прымеркавана да 30-годдзя арганізацыі. Удзельнікамі пасяджэння сталі рэктары ВНУ-членаў ЕАУ. Зараз міжнародная арганізацыя аб'ядноўвае 139 універсітэтаў Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Латвіі, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана і Украіны.

На пасяджэнні падвялі вынікі працы асацыяцыі за 2018 год, вызначылі ключавыя кірункі ўдасканалення супрацоўніцтва ўніверсітэтаў-членаў ЕАУ, а таксама разгледзелі перспектыўныя шляхі развіцця дзейнасці асацыяцыі і сеткавага ўзаемадзеяння.

Адным з важных арганізацыйных пытанняў з'езда стала зацвярджэнне новага складу прэзідыума савета. Па выніках выбараў рэктар БДУ Андрэй Кароль абраны віцэ-прэзідэнтам ЕАУ.

У рамках пасяджэння з'езда ад імя міністра адукацыі Беларусі рэктар БДУ Андрэй Кароль уручыў падзячны ліст з каштоўным падарункам рэктару МДУ імя М. В. Ламаносава Віктару Садоўнічаму. Гэтай узнагароды расійскі акадэмік ганараваны за вялікі асабісты ўнёсак ва ўмацаванне беларускарасійскіх адносін у сферы адукацыі і навукі, станаўленне адзінай еўразійскай адукацыйнай прасторы і ў сувязі з 80-годдзем.

Таксама прайшоў шэраг перамоў кіраўніцтва БДУ і ВНУ-членаў ЕАУ па пытаннях сумесных адукацыйных і навуковых праграм, правядзення навуковых даследаванняў, акадэмічнай мабільнасці. У прыватнасці, адбыліся сустрэчы з рэктарамі Нацыянальнага ўніверсітэта Узбекістана імя Мірзы Улугбека, Казахскага нацыянальнага ўніверсітэта імя аль-Фарабі, Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, а таксама Кенцкага ўніверсітэта.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

---

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

## Узнагароды Міністэрства адукацыі і БДУ

**ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ** Міністэрства адукацыі за стварэнне і паспяховую эксплуатацыю ў навуковых і адукацыйных мэтах напаспадарожніка ўшанаваны старшы выкладчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій **Іван Шалатонін**.

Граматамі Міністэрства адукацыі ўзнагароджаны старшы выкладчык кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій **Аляксандр Спірыдонаў** і загадчык лабараторыі НДЛ інфармацыйна-вымяральных сістэм **Ігар Сцяцко**.

Падзякі Міністэрства адукацыі Беларусі за папулярызацыю ў СМІ адукацыйнай, навуковай, інавацыйнай дзейнасці і моладзевай палітыкі ганаравана прэс-служба БДУ.

Узнагароджанне адбылося 18 сакавіка ў рамках Савета БДУ. Цырымонія прайшла з удзелам міністра адукацыі Ігара Карпенкі.

**ПАДЗЯКА МІНІСТРА АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ** абвешчана дырэктару РІК імя Канфуцыя БДУ **Анатолію Тозіку** за значны асабісты ўнёсак у развіццё беларуска-кітайскага супрацоўніцтва і ў сувязі з 70-гадовым юбілеем.

Анатолій Тозік адзначаны таксама падзякай рэктара БДУ. У сваім віншаванні Андрэй Кароль падзякаваў Анатолію Тозіку за актыўную дзейнасць па стварэнні на базе беларускай ВНУ сумеснай адукацыйнай структуры БДУ–ДПУ (Dalian University of Technology).

**ПАДЗЯКАЙ РЭКТАРА БДУ** за шматгадовую плённую працоўную дзейнасць на пасадах дэканаў факультэтаў біялагічнага і прыкладной матэматыкі і інфарматыкі ўзнагароджаны **Уладзімір Лысак** і **Павел Мандрык**. Кіраўнік БДУ Андрэй Кароль падзякаваў ім за працяглую прафесійную працу на пасадах дэканаў і выказаў спадзяванне на далейшае плённае супрацоўніцтва.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 сакавіка 2019 года, № 5 (2211)

# Адказы на пытанні


*Андрэй Кароль прапануе інавацыйныя формы навучання*

**Каля 50 выкладчыкаў БДУ прынялі ўдзел у семінары «Як распрацаваць адкрытае (эўрыстычнае) заданне». Гэта адзін з заняткаў праграмы павышэння кваліфікацыі «Тэхналогіі эўрыстычнага навучання ў вышэйшай школе «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава». Аўтарам і вядучым курса выступіў рэктар БДУ Андрэй Кароль.**

Сёння актуальнымі задачамі з'яўляюцца індывідуалізацыя працэсу падрыхтоўкі студэнтаў, стварэнне ўмоў для раскрыцця іх творчага патэнцыялу. Як адзначыў рэктар БДУ, для паспяховасці і запатрабаванасці выпускнікоў важна навучыць іх бачыць галіну свайго нявет дання, выходзіць за межы стэрэатыпаў, глядзець на сябе збоку. На гэта накіравана эўрыстычнае навучанне, якое спрыяе раскрыццю навучэнца. Сучасны педагог павінен арганізаваць працэс і ўмовы для самарэалізацыі кожнага студэнта, даць яму магчымасць стварыць адукацыйны прадукт, адрозны ад іншых.

Выступленне рэктара БДУ Андрэя Караля выклікала актыўную дыскусію. Выкладчыкаў хвалявалі пытанні метадалогіі, карэкціроўкі зместу адукацыйных стандартаў з улікам укаранення інавацыйных формаў навучання. Падчас першага семінара ўдзельнікі авалодалі методыкай складання адкрытых заданняў – найважнейшым кампанентам зместу эўрыстычнага навучання. Гэтыя заданні не маюць адназначна правільных адказаў і даюць магчымасць студэнту зрабіць уласнае адкрыццё. Усе атрыманыя вынікі ўнікальныя, бо адлюстроўваюць ступень індывідуальнасці і творчага самавыяўлення студэнта.

Алгарытм складання эўрыстычнага задання быў апрабаваны ўдзельнікамі падчас працы ў малых групах. Выкладчыкі распрацавалі адкрытыя заданні, абаранялі іх перад вядучым семінара і калегамі. З улікам атрыманых экспертных ацэнак у найбліжэйшы час працягнецца праца над карэкціроўкай заданняў у дыстанцыйнай форме. У далейшым распрацоўкі будуць скарыстаны на іншых семінарах для праектавання заняткаў эўрыстычнага тыпу і эўрыстычных інтэрнэт-заняткаў.

Праграма «Тэхналогіі эўрыстычнага навучання ў вышэйшай школе «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па-рознаму, але аднолькава» з'яўляецца працягам серыі адукацыйных мерапрыемстваў, якія рэалізуюцца ў рамках сістэмы крэатыўнай адукацыі БДУ, накіраваных на фарміраванне эўрыстычных якасцяў педагога. Сёлета яе фармат прадугледжвае выкарыстанне рэсурсаў міжуніверсітэцкага партала «Метадалогія, змест і практыка крэатыўнай адукацыі» і дыстанцыйных формаў навучання на базе LMS Moodle. Кожны выкладчык распрацуе эўрыстычнае заданне, план эўрыстычнага занятку і інтэрнэт-занятку з перспектывай іх далейшага ўкаранення ў навучальны працэс па сваіх дысцыплінах. Вынікі апрабацыі ўдзельнікі адлюструюць у навукова-метадычных матэрыялах, якія будуць апублікаваны на міжуніверсітэцкім партале і ў адукацыйных практыкумах па дысцыплінарных кірунках.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

# Пра што кажуць вынікі зімовай сесіі?

**Па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі працэнт абсалютнай паспяховасці па комплексе БДУ за апошнія 5 гадоў павялічыўся на 5,3 %. У параўнанні з папярэдняй сесіяй (2017–2018 навуч. год) паспяховасць у гэтым навучальным годзе павысілася на 1,3 %; на першым курсе – на 2 %, на другім – на 4,3 %, на трэцім курсе паменшылася на 0,2 %, на чацвёртым паменшылася на 1,7 %, на пятым павялічылася на 1,5 %.**

Павысілася паспяховасць на наступных факультэтах: факультэт журналістыкі – на 3,4 %, юрыдычны – 3,2 %, ФФСН – 8,9 %, філалагічны – 4,2 %, ФМА – 3,8 %, ФСК – 4,3 %, геаграфічны – 4,5 %, біялагічны – 0,9 %. Упала паспяховасць на факультэтах: гістарычны – на 8,4 %, Інстытут тэалогіі – 5,8 %, эканамічны – 2 %, ваенны – 13 %, ФПМІ – 2,2 %, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій – 2,1 %, МДЭІ імя А. Д. Сахарава – 2,6 %. На астатніх факультэтах – без змен.

Працэнт студэнтаў, якія маюць па выніках зімовай сесіі 9 і 10 балаў, павялічыўся на 0,3 %, якія маюць нездавальняючыя адзнакі, паменшыўся на 1 %, змяшаных адзнак – паменшылася на 6,6 %. Колькасць студэнтаў першага курса, якія маюць нездавальняючыя адзнакі, зменшылася на 2 %.

Паспяховасць студэнтаў-платнікаў першага курса па комплексе БДУ павялічылася на 7,6 %. Пры гэтым працэнт студэнтаў, якія здалі сесію на 9 і 10, паменшыўся на 1,6 %, а працэнт тых, хто атрымаў нездавальняючыя адзнакі, паменшыўся на 5 %.

### ПРА ПАСПЯХОВАСЦЬ У ЦЭЛЫМ

Па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі працэнт абсалютнай паспяховасці па комплексе БДУ за апошнія 5 гадоў павялічыўся на 5,3 %. На першым курсе вырас на 10,4 %, на другім – на 7,1% , на трэцім – 3,3 %, на чацвёртым паменшыўся на 5,1 %, на пятым павялічыўся на 4,4 %. У інстытутах комплексу БДУ паспяховасць павялічылася на 5,1 %.

У разрэзе гуманітарных факультэтаў на факультэце сацыякультурных камунікацый, філалагічным і факультэце філасофіі і сацыяльных навук назіраецца паляпшэнне паспяховасці, якая павялічылася ў сярэднім на 10,7 %. Пагаршэнне паспяховасці адзначаецца ў Інстытуце тэалогіі, на эканамічным і гістарычным факультэтах.

На прыродазнаўчых факультэтах карціна горшая. Толькі на трох з іх паспяховасць за апошнія 5 гадоў вырасла. Гэта геаграфічны, фізічны і біялагічны факультэты. На ваенным факультэце за апошнія 5 гадоў паспяховасць упала на 9,2 %.

Сярэдні паказчык абсалютнай паспяховасці студэнтаў дзённай формы навучання за апошнія 5 гадоў складае 84,2 %. Па выніках зімовай сесіі 2018–2019 навуч. года найлепшы паказчык абсалютнай паспяховасці студэнтаў у філалагічнага факультэта – 90,5 %, самы нізкі на эканамічным факультэце – 76,4 %.

Працэнт студэнтаў, якія маюць па выніках зімовай сесіі 9 і 10 балаў, за апошнія 5 гадоў вагаецца ад 6,4 % да 6,7 %, якія маюць нездавальняючыя адзнакі, – ад 18 % да 14 % (тэндэнцыя на памяншэнне), а змяшаныя адзнакі (ад 4 да 10 балаў) – ад 39,1 % да 33,4 %.

Па выніках дзвюх апошніх зімовых сесій колькасць студэнтаў, якія маюць тры нездавальняючыя адзнакі, на першым, другім і чацвёртым курсах паменшылася (3–11 чалавек), а на трэцім павялічылася (на 9 чалавек). Колькасць студэнтаў першага курса, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі, за апошнія 5 гадоў значна паменшылася (з 23 % да 13 %).

Найлепшы паказчык абсалютнай паспяховасці студэнтаў першага курса – на факультэце сацыякультурных камунікацый (94 %), найгоршы – на эканамічным факультэце (70,6 %), сярэдні паказчык па комплексе БДУ складае 80,6 %.

Паспяховасць студэнтаў-платнікаў першага курса за апошнія 5 гадоў павялічылася з 65,1 % да 82,3 %. Працэнт студэнтаў, якія маюць па выніках зімовай сесіі 9 і 10 балаў, за апошнія 5 гадоў вагаецца ад 0,9 % да 3,1 %, якія маюць нездавальняючыя адзнакі, – ад 32 % да 17 %, а змяшаныя адзнакі (ад 4 да 10 балаў) – ад 25,8 % да 34,4 %.

Паспяховасць студэнтаў-платнікаў другога, трэцяга і чацвёртага курсаў таксама палепшылася, што нельга сказаць пра пяты курс, дзе паспяховасць зменшылася з 82,15 % да 61,9 %.

***Алена ДАСТАНКА,*
*начальнік Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці***

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

**Количество студентов, имеющих неудовлетворительные оценки**

Количество студентов, имеющих три неудовлетворительные отметки

| | 2014/2015 | 2015/2016 | 2016/2017 | 2017/2018 | 2018/2019 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 курс | 63 студ. | 36 студ. | 34 студ. | 19 студ. | 16 студ.↓ |
| 2 курс | 68 студ. | 36 студ. | 42 студ. | 33 студ. | 22 студ.↓ |
| 3 курс | 38 студ. | 25 студ. | 29 студ. | 15 студ. | 24 студ.↑ |
| 4 курс | 29 студ. | 10 студ. | 21 студ. | 17 студ. | 10 студ.↓ |
| 5 курс | 13 студ. | 2 студ. | 16 студ. | 1 студ. | 1 студ. |
| По комплексу БГУ | 211 студ. | 109 студ. | 142 студ. | 85 студ. | **73 студ.↓** |

Студенты 1 курса, имеющие неудовлетворительные отметки (%)




www.bsu.by

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

**Абсолютная успеваемость студентов дневной формы по итогам зимней сессии в 2018-2019 учебном году**




www.bsu.by

«Неабходна захаваць лідарскія пазіцыі ў профільнай адукацыйнай і навуковай дзейнасці, а таксама ўкараняць найноўшыя лічбавыя падыходы і метады дыстанцыйнага навучання», – так лічыць Вадзім ДЗЯМІДЧЫК, новы дэкан біялагічнага факультэта, прафесар, доктар біялагічных навук. Якія задачы ставіць перад сабой кіраўнік, якія змены чакаюцца на біяфаку? Пра гэта ён распавёў на пасяджэнні Савета БДУ.



# Біяфак 3.0

Сёння біялагічны факультэт – гэта найбуйнейшы прыродазнаўчы факультэт БДУ і самы вялікі па колькасці студэнтаў біяфак ва Усходняй Еўропе (каля 2000 студэнтаў). Тут 9 кафедраў і 9 навукова-даследчых лабараторый, працуе больш за 100 выкладчыкаў. Факультэт мае найбольшую колькасць спецыялістаў са ступенямі дактароў і кандыдатаў біялагічных навук сярод устаноў краіны, а таксама найбольшую колькасць аспірантаў і магістрантаў па біялагічных спецыяльнасцях.

Больш за 20 гадоў біялагічны факультэт узначальваў Уладзімір Васільевіч Лысак. Ён сфарміраваў высокакваліфікаваны калектыў і асяроддзе, дзе кожны супрацоўнік змог зрабіць унёсак у агульны вынік. У. В. Лысаку была ўручана падзяка рэктара БДУ за прафесійнае кіраўніцтва факультэтам, а таксама калегіяльна Савет БДУ прыняў рашэнне пра хадайніцтва аб прысваенні яму звання «Заслужаны работнік адукацыі Беларусі».

Новым кіраўніком 5 сакавіка быў прызначаны Вадзім Віктаравіч Дзямідчык. Ён спецыяліст у галіне клетачнай біялогіі, біяфізікі, біяінжынерыі і фізіялогіі раслін. Яго кар'ера ў якасці выкладчыка БДУ пачалася ў 1997 годзе пасля завяршэння аспірантуры. У перыяд з 2000 па 2011 год працаваў навуковым супрацоўнікам Універсітэта Кембрыджа, а затым лектарам і кіраўніком другога года навучання ва Універсітэце Эсекса. З 2011 года – загадчык кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін біялагічнага факультэта БДУ. Прафесіяналізм, міжнародны досвед дазволяць дэкану працягнуць эфектыўную працу падраздзялення і вызначыць перспектыўныя кірункі. Ідэямі паляпшэння факультэта ён падзяліўся 18 сакавіка на Савеце БДУ.

– Вызначаны наступныя задачы: мадэрнізаваць матэрыяльна-тэхнічную базу ў адпаведнасці з сучасным развіццём біялогіі для пасляховага выканання задач канцэпцыі «Універсітэт 3.0». Таксама ставім перад сабой мэту захаваць і прымножыць прамысловую і выпрабавальную базу: біяэквівалентныя эксперыменты, вытворчасць лекаў і ветпрэпаратаў, мікраклонаў раслін, бактэрыяльных сродкаў абароны раслін і біярэгулятараў, – пералічвае Вадзім Віктаравіч.

Ключавы момант даклада – пашырэнне поля спецыяльнасцяў, праграм у галіне біяінжынерыі і біятэхналогіі, фармакалогіі, клетачнай, малекулярнай і сістэмнай біялогіі. Пастаўлена задача запусціць спецыяльнасці на стыку навуковых галін.

– Плануем адкрыць новыя спецыяльнасці: «біятэхналогія», «біяінжынерыя», «клетачная біялогія» і, верагодна, іншыя, – кажа Вадзім Дзямідчык. – Важна забяспечыць збалансаванае спалучэнне фундаментальнай і прыкладной тэхнічнай падрыхтоўкі. У развіцці гэтых кірункаў, асабліва біятэхналогіі, маецца вялікая зацікаўленасць урада, будучых вытворчасцяў, прыватных кампаній і спонсараў.

Акрамя гэтага пастаўлена стратэгічная мэта – адкрыць сумесна з факультэтамі БДУ, якія моцныя ў інфармацыйных тэхналогіях, міждысцыплінарную спецыяльнасць «біяінжынерыя і біяінфарматыка». Дэкан разважае пра тое, што трэба рыхтаваць спецыяліста, які б валодаў ведамі адначасова па біялогіі, матэматыцы і інфарматыцы. А для гэтага навучанне павінна прыкладна роўна ажыццяўляцца некалькімі факультэтамі БДУ.

Актуальны фокус на ўстойлівую падрыхтоўку маладых навуковых кадраў. Рыхтуюцца новыя магістарскія праграмы (у тым ліку на англійскай мове), такія як «біяхімія» (з 2019 г.), «мікрабіялогія» (з 2019 г.), у найбліжэйшай будучыні таксама «біятэхналогія» (2020–2022 гг.) і «клетачная і малекулярная біялогія» (English; 2019–2022 гг.). Таксама гэта новыя спецыяльнасці падрыхтоўкі ў аспірантуры: «клетачная біялогія», «біяінжынерыя», «малекулярная біялогія» і «нейрабіялогія». Яшчэ адзін пункт на разглядзе – свой доктарскі савет па абароне дысертацый па дадзеных спецыяльнасцях. Вядома, гэта задачы няпростыя, яны патрабуюць стараннай распрацоўкі.

Што яшчэ тычыцца навучальнай працы, то ў планах адзначана нарошчванне і паляпшэнне якасці электронных навучальна-метадычных комплексаў, распрацоўка кантэнту для электроннага навучання. Яшчэ ноу-хау для біяфака – увядзенне сістэмы кейс-стадыс у дысцыпліны старэйшых курсаў і ў магістарскую падрыхтоўку. Апроч іншага ёсць задачы па стварэнні сумесных праграм навучання з замежнымі УВА.

Была вылучана значнасць навуковай працы. Па меркаванні кіраўніка факультэта, сёння выкладчык павінен займацца навукай, а для гэтага трэба стварыць прыдатныя ўмовы, таму важнае стымуляванне ўдзелу ў НДР і НДРС. Факультэту варта больш актыўна ўваходзіць у ДП Беларусі, навуковыя праграмы ЕС, міжнародныя праекты ДКНТ, праграмы Саюзнай дзяржавы.

Вадзім Дзямідчык звярнуў увагу на неабходнасць удасканалення некаторых структур факультэта. Сярод іх батанічны сад, які з'яўляецца адным з найстарэйшых у краіне. Гэты важны навучальны цэнтр па фларыстыцы і аграбіятэхналогіях патрабуе пабудовы ландшафтных зон, больш актыўнага прыцягнення наведнікаў, пазабюджэтных сродкаў. Акрамя гэтага будзе правільным рашэннем надаць калекцыі заалагічнага музея статусу «нацыянальнага здабытку», што забяспечыць мэтавае дзяржаўнае фінансаванне на захаванне і развіццё фондаў.

– Таксама мадэрнізацыя патрэбная навучальна-навуковаму цэнтру «Нарачанская біялагічная станцыя імя Г. Г. Вінберга». Гэта адзіны ў краіне цэнтр высокакваліфікаванай падрыхтоўкі спецыялістаў па біяразнастайнасці і гідраэкалогіі. Ён патрабуе рэбрэндынгу, развіцця дзіцячага і падлеткавага экатурызму, – каментуе кіраўнік.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

## Даведка

**В. В. Дзямідчык** – выпускнік біяфака 1994 года, скончыў у 1997 годзе аспірантуру БДУ, у 1998 г. абараніў кандыдацкую, а ў 2011 годзе – доктарскую дысертацыю (яна была прызнана найлепшай па прыродазнаўчых навуках па ацэнцы ВАК Беларусі). За час працоўнай дзейнасці кіраваў больш як 40 навуковымі праектамі ў Беларусі, Вялікабрытаніі і Расійскай Федэрацыі, а таксама з'яўляўся навуковым кіраўніком больш чым 60 студэнтаў і аспірантаў.

Аўтар каля 300 навуковых прац, уключаючы артыкулы ў Nature, Plant Cell і Annual Reviews of Plant Biology, манаграфій у выдавецтве Springer. Па сістэме Google Scholar колькасць цытаванняў аўтара складае 6272.

З'яўляецца членам рэдакцыйнай калегіі шэрагу міжнародных навуковых часопісаў, сакратаром экспертнага савета № 34 (фізіка-хімічная біялогія) ВАК Беларусі. Узначальвае навукова-тэхнічную секцыю экспертнага савета № 1 па прыродазнаўчых навуках ДКНТ Беларусі.

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**01 красавіка Акаеў Яўген Барысавіч,** вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ хіміка-аналітычных сістэм
**01 красавіка Цітавец Аляксандр Антонавіч,** дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі
**05 красавіка Гарбачук Мікалай Іванавіч,** дацэнт кафедры фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі
**05 красавіка Пракулевіч Уладзімір Антонавіч,** загадчык кафедры мікрабіялогіі
**08 красавіка Бандарук Яўген Васільевіч,** старшы навуковы супрацоўнік НДЛ біяхіміі абмену рэчываў
**12 красавіка Вяршок Ірына Леанідаўна,** дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права
**21 красавіка Хвір Віктар Іванавіч,** дацэнт кафедры заалогіі
**24 красавіка Лаўрова Вольга Анатольеўна,** дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу
**27 красавіка Лебядзінскі Сяргей Іванавіч,** загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай
**28 красавіка Афоненка Аляксандр Анатольевіч,** прафесар кафедры квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін; дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу; вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі; ядзернай фізікі; псіхалогіі; агульнай і клінічнай псіхалогіі; гісторыі беларускай літаратуры; мытнай справы.

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных; медыялогіі; перыядычнага друку і вэб-журналістыкі; псіхалогіі; філасофіі культуры; тэорыі літаратуры; камунікатыўнага дызайну; міжнародных адносін; аналітычнай хіміі; арганічнай хіміі; аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізіялогіі чалавека і жывёл; генетыкі; мікрабіялогіі; агульнай матэматыкі і інфарматыкі; тэорыі функцый; вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі; вышэйшай матэматыкі; вылічальнай матэматыкі; энергафізікі; камп'ютарнага мадэлявання; квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі; медыялогіі; перыядычнага друку і вэб-журналістыкі; філасофіі культуры; крыніцазнаўства; гісторыі Расіі; філасофіі і метадалогіі навукі; сацыялогіі; тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства; кітайскай філалогіі; інфармацыйных тэхналогій; міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права; педагогікі і праблем развіцця адукацыі; канстытуцыйнага права; міжкафедральнага цэнтра – кафедры ЮНЕСКА па прыродазнаўчай адукацыі; аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі; карпаратыўных фінансаў; банкаўскай эканомікі; радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі; бія- і нанамеханікі; вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; батанікі; фізічнай электронікі і нанатэхналогій; тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій; медыялогіі; філасофіі і метадалогіі навукі; агульнай і клінічнай псіхалогіі; нямецкага мовазнаўства; рускай мовы; мастацтваў і асяроддзевага дызайну; культуралогіі; камп'ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі; інфармацыйных тэхналогій; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцей; мовазнаўства і краіназнаўства Усходу; англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцей; раманскіх моў; міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права; міжнароднага турызму; педагогікі і праблем развіцця адукацыі; высокамалекулярных злучэнняў; эканамічнай інфарматыкі; эканамічнай тэорыі; канстытуцыйнага права; фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці.

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: дызайну моды; англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцей.

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ матэматычнага мадэлявання і аналізу дадзеных.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.*

**ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ прафесійнага развіцця;
ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: бізнес-адміністравання; лагістыкі (3); інавацыйнага кіравання;
СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: эканомікі і менеджменту; бізнес-адміністравання; міжнароднага бізнесу; прававых і гуманітарных дысцыплін; лагістыкі (2); інавацыйнага кіравання.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, тэл. 3060027, 3060028, e-mail: sbmt@sbmt.by, mail@sbmt.by, http://www.sbmt.by.*

**НДІ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ВЯДУЧАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі эксперыментальнай фізікі высокіх энергій.

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі ядзернай оптыкі і космамікрафізікі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220006, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226 42 31.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Вясновыя дні адчыненых дзвярэй стартавалі 20 сакавіка ў БДУ** – БелТА, zviazda.by, radiomir.by, «Мінск-Навіны», wuz.by (04.03), Мінск-ТБ (20.03).

**БДУ прадставіў 18 навукова-тэхнічных распрацовак на XV Пецярбургскім тэхнічным кірмашы і атрымаў 10 узнагарод** – wuz.by (11.03), БелТА, interfax.by (18.03), edu.gov.by (19.03).

**Кабінет грэчаскай філалогіі адкрылі 12 сакавіка ў БДУ** – sb.by (11.03), БелТА, БТ-1, interfax.by, zviazda.by (12.03), Беларусь-24 (13.03), «Настаўніцкая газета» (19.03) .

**Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь як каштоўнасны выбар: 25 гадоў здзяйсненняў і пераўтварэнняў» прайшла 4 сакавіка ў БДУ** – wuz.by (28.02), БелТА, pravo.by (04.03), union.by (05.03), mosk.minsk.gov.by (08.03), sb.by (15.03).

**Кейс-чэмпіянат Business Case Student Competition 2019 упершыню пройдзе ў БДУ** – wuz.by (12.03), ecopress.by (13.03), zviazda.by (14.03).

**Інтэрактыўнае друкаванае выданне па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання па фізіцы распрацавана ў Ліцэі БДУ** – zviazda.by, wuz.by (01.03), ecopress.by (04.03), znaniebelarus.by (05.03).

**Праект БДУ Quali.me ўдастоены спецыяльнага прыза на міжнародным форуме «Моладзь Еўразіі: будучыню будуем разам!»** – ia-centr.ru (18.02), press-unity.com (20.02), sputnik.by (24.02), wuz.by (27.02), zviazda.by (03.03).

**У БДУ стартаваў новы сезон праекта «Студэнт БДУ на тыдзень»** – БелТА, wuz.by (21.02), edu.gov.by, bg.by, ecopress.by, news.21.by (22.02), «Мінск–Навіны» (25.02).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 сакавіка 2019 года, № 5 (2211)

# Стваральнікам вышэйшай адукацыі і навукі Беларусі прысвячаецца…






Фотаздымак Таццяны ТАРАН

Да стагоддзя першай вышэйшай навучальнай установы Беларусі выдадзена другая кніга з серыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: 100 гадоў на карысць Айчыны». У ёй прадстаўлены жыццёвыя і творчыя біяграфіі 28 выбітных навукоўцаў у розных галінах ведаў, якія працавалі ў БДУ ў 1919–1961 гг. Мы пагаварылі з навуковым рэдактарам кнігі і адным з аўтараў нарысаў, загадчыкам кафедры гісторыі Расіі прафесарам **Алегам ЯНОЎСКІМ** пра ўнёсак выдатных навукоўцаў БДУ ў развіццё нацыянальнай адукацыі і навукі, а таксама пра значэнне гістарычнага кантэксту ў сучасным аблічы нашага ўніверсітэта.

***– Алег Антонавіч, першая кніга дадзенай серыі выйшла ў 2017 годзе, у ёй апавядаецца пра бацькоў-заснавальнікаў БДУ. Вы, як спецыяліст па гісторыі БДУ, доўгі час выношвалі гэту ідэю. У чым яе ўнікальнасць?***

– Серыя кніг пад агульнай назвай «Інтэлектуальная эліта Беларусі» прымеркавана да надыходзячага 100-гадовага юбілею нашага ўніверсітэта. Гэта знакавая падзея для ўсёй краіны, паколькі гаворка ідзе не толькі пра стварэнне першага сапраўды беларускага Універсітэта, але і пра пачатак фарміравання цэласнай сістэмы вышэйшай адукацыі і навукі Беларусі, у чым ролю БДУ цяжка пераацаніць. Пры падтрымцы кіраўніцтва БДУ за апошнія тры гады выкладчыкі гістарычнага факультэта прарабілі комплексную пошукавую працу, якая дазволіла сабраць унікальныя гістарычныя матэрыялы. У аснову дадзенай кнігі і серыі ў цэлым пакладзены прасапаграфічны метад. Ён дазволіў стварыць не проста нейкую калектыўную біяграфію найбольш выбітных прадстаўнікоў універсітэцкай карпарацыі, але праз персаніфікацыю аповеду адлюстраваць незвычайнасць кожнага чалавека і яго значны ўнёсак для нашай краіны.

Аб'ектам гістарычных даследаванняў можа быць мегагісторыя – яна падуладная глабальнаму мысленню, усёахопнасці. Ёсць і мікрагісторыя – дапусцім, гісторыя нашай alma mater у межах навукова-адукацыйнай сферы краіны. Але абодва падыходы ў асэнсаванні гісторыі без чалавека не існуюць, бо гісторыя саткана з вынікаў дзейнасці канкрэтных людзей. Захапляючыся мегапраектамі, мы пакідаем у забыцці асоб, якія пражылі вельмі складанае і вынікове жыццё. Нават у гісторыі нашага ўніверсітэта мы шмат чаго не ведаем з таго, што было важным складнікам яго дзейнасці 20, 50 і 100 гадоў назад. Мы «забраліся на плечы тытанаў» і не ўсведамляем, дзякуючы каму мы сёння маем магчымасць ганарыцца сваёй ВНУ. Мы прывыклі казаць пра сябе, пра сучасныя вынікі, а пра дасягненні папярэднікаў нярэдка згадваем мімаходзь. Але зададзімся пытаннямі: а кім усебакова прапісаны асоба і заслугі Усевалада Ігнатоўскага? Хто належным чынам увекавечыў імя і дзеі нашага першага рэктара Уладзіміра Пічэты? Свайго актыўнага працягу чакае ўніверсітэцкая серыя «Памяць і слава», у якой абавязкова павінны знайсці адлюстраванне справы і думкі сотняў інтэлектуалаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Так, імёны некаторых ушанаваны ў мемарыяльных дошках, але хацелася б, каб імя У. І. Пічэты гучала ў назве адной з цэнтральных вуліц горада: там, дзе ён ствараў наш беларускі Універсітэт!

***– У дзвюх кнігах апавядаецца пра 55 выбітных навукоўцаў, якія пакінулі вялікую інтэлектуальную спадчыну для нашай краіны. Чаму выбар спынілі менавіта на іх?***

– Я з 1973 года пагружаны ў гісторыю вышэйшай школы Беларусі і ўсяго СССР. За дзесяцігоддзі ў асабістым архіве назапасіўся вялікі дакументальны і бібліяграфічны матэрыял, фактаграфія. Гэта дазваляе бачыць БДУ і маштабна, і ў дэталях. Але важнейшае за ўсё тое, што побач сабралася кола неабыякавых, добра дасведчаных у «рамястве» гісторыка калегаў – сталых і маладых даследчыкаў. А імёны для ўключэння ў дзве кнігі, якія ўжо адбыліся (як і ў трэцюю, што рыхтуецца сёння), усебакова абмяркоўваліся з удзелам кіраўніцтва ўніверсітэта, дэканаў і прафесараў многіх факультэтаў. І не было нейкіх вострых спрэчак, пярэчанняў. Усе імкнуліся да аднаго: як бы не забыцца кагосьці, як максімальна поўна суаднесці асабістую біяграфію з біяграфіяй універсітэта ці канкрэтнага факультэта, кафедры. Вядома, зыходзілі з несумненна высокай знакавасці асобы, як і прымаючы ў разлік магчымасць правядзення паўнавартаснага даследавання.

Я ганаруся тым, што ўсе аўтары вельмі добрасумленна і творча правялі свае даследаванні. Яны адкрылі такія «навуковыя шлюзы», пра наяўнасць якіх я раней і не думаў. Выйшлі на сайты, музеі, бібліятэкі, усталявалі цесныя кантакты са сваякамі. Мы многіх асоб проста рэанімавалі з гэтага бяспамяцтва.

Узяць таго ж Фаму Георгіевіча Асіпенку – найцікавейшая біяграфія. Адзін з заснавальнікаў арганічнай хіміі, стваральнік адпаведнай кафедры. У асабістай справе не было звестак, калі ён памёр. І на факультэце ніхто не змог нам дапамагчы. У выніку аўтар нарыса Сцяпан Цемушаў і я выйшлі на загс, дзе працуе выпускніца гістфака. І з яе дапамогай знайшлі-такі дакладную дату смерці прафесара, дакладны адрас яго апошняга месца працы, месца жыхарства.

Ці яшчэ была нагода ўскрыкнуць «эўрыка!». А. П. П'янкоў – трэці дэкан гістарычнага факультэта і першы, хто абараніў доктарскую дысертацыю па расійскай медыевістыцы. Калі я ўжо падрыхтаваў матэрыял пра яго, выйшаў на мяне ўнук Аляксея Пятровіча і паведаміў, што ў яго захаваўся надзвычай багаты сямейны архіў дзеда. Цяпер з маім калегам Міхаілам Фёдаравічам Шумейкам яго вывучаем. А там унікальныя рэчы – перапіска з акадэмікам Дзмітрыем Грэкавым, гісторыкам і наркамам Міхаілам Пакроўскім. Гэта не апошнія людзі ў гісторыі СССР. Хоць перапіску наш дэкан вёў з імі ледзь не на «сяброўскай назе»! П'янкоў сам быў буйным расіязнаўцам, але ён жа стварыў першую праграму па гісторыі Беларусі, вывучыў беларускую мову, хоць сам нарадзіўся ў Пермі і паспеў папрацаваць у Палтаве – вось такі наш герой. Аляксандр Савіч – унікальны гісторык, таксама расіязнаўца, але ўжо беларускага паходжання. Шмат гадоў назад яшчэ ў Мардовіі неяк трапіў мне ў рукі каляндар. У ім была паказана дата і месца нараджэння беларускага гісторыка Савіча. А вось на радзіме ў Беларусі не сустракаў нічога падобнага. Прыйшлося грунтоўна засесці ў архівы, каб імя аднаго з першых прафесараў БДУ было адроджана. Тым больш што, як высветлілася, яго творчае жыццё ўсеяна проста дэтэктыўнымі сюжэтамі.

> ✓
>
> Самыя разумныя людзі займаліся аналізам і рэалізацыяй таго, што вызначыла на дзесяцігоддзі першынство ўніверсітэта ў сістэме вышэйшай школы БССР, яго высокі аўтарытэт у цэлым у СССР.

Не менш цікавым і павучальным было жыццё ў навуцы і ў савецкіх універсітэтах намесніка Пічэты Саламона Кацэнбогена (а быў ён яшчэ і намеснікам наркама асветы ССРБ). Пра яго, скрупулёзна сабраўшы шырокі фактычны матэрыял, напісаў мой вучань Андрэй Максімчык. Ён падняў унікальны пласт дакументаў, знайшоў у Екацярынбургу сямейны архіў, унука – у Германіі, унучку – у Піцеры (яны далі сапраўды неацэнныя дакументы пра БДУ і Беларусь пачатку 1920-х гадоў). Гэты ўніверсітэцкі філосаф быў рэктарам Казанскага ўніверсітэта, потым выявіў сябе ў ВНУ Свярдлоўска. Калі ён пакідаў універсітэт, студэнты напісалі яму шчыры падзячны ліст, які цяпер упрыгожвае калекцыю музея гісторыі БДУ.

У абедзвюх кнігах шмат гучных прозвішчаў, той жа Георгій Канстанцінавіч Жукаў, які займаўся ваеннай падрыхтоўкай студэнтаў у 20–30-я гг. Ваенная падрыхтоўка не страціла сваёй актуальнасці і цяпер. А калі пачалася фізкультурызацыя? Раней гэта лічылася буржуазнай з'явай, пакуль у 1928 годзе на палявыя зборы пад Бабруйскам не прыехалі рэктар У. І. Пічэта, ваенкам М. М. Пятроў і некаторыя члены Савета БДУ. Афіцэры ім кажуць: вашы студэнты кволыя і фізічна не падрыхтаваныя. Кіраўнікі ўніверсітэта вяртаюцца ў Мінск, збіраюць савет і прымаюць рашэнне ўвесці рэгулярныя фізкультурныя заняткі ў рамках навучальнага працэсу. І да ваеннай кафедры дадаецца фізкультурная. Нават за такой як бы ардынарнай падзеяй у гісторыі БДУ стаялі канкрэтныя людзі, іх ініцыятыва і ўменне знайсці дакладнае рашэнне не рухалі наш універсітэт, удасканальвалі яго шматбаковую дзейнасць. А якія гарачыя дыскусіі разгорталіся ў 20–30-я гады вакол асэнсавання шляхоў далейшага развіцця! Напрыклад, як арганізаваць максімальна эфектыўны навучальны працэс – колькі гадоў вучыць будучага спецыяліста, з якім методыкі выкарыстоўваць, у якім аб'ёме даваць лекцыйны матэрыял, якое месца павінна займаць практыка? Гэтыя і шматлікія іншыя пытанні былі арганічнай часткай інтэлектуальнай працы тых, хто ўвасабляў БДУ.

Самыя разумныя людзі займаліся аналізам і рэалізацыяй таго, што вызначыла на дзесяцігоддзі першынство ўніверсітэта ў сістэме вышэйшай школы БССР, яго высокі аўтарытэт у цэлым у СССР. Так, гэта інтэлектуальная эліта Беларусі, а не толькі БДУ. Таму што яны, працуючы ў БДУ, працавалі на ўсю рэспубліку, на ўвесь Савецкі Саюз.

***– Якім будзе працяг у серыі?***

– Мы ўжо рыхтуем трэцюю кнігу. Храналагічна ва ўсіх пяці кнігах задумана працягнуць аповед пра тых, каго мы называем «заснавальнікамі», гэта значыць пачынаць апавяданне з 1919 года. Аднак у кожнай наступнай кнізе будуць прадстаўлены нарысы пра тых, хто прыняў інтэлектуальную эстафету, прымножыў славу БДУ. Так што ўмоўна вылучаны пяць перыядаў па 20 гадоў кожны. У першай кнізе ахопліваецца міжваеннае 20-годдзе, у другой – да 1961 года і гэтак далей. У трэцяй кнізе павінны быць прадстаўлены спецыяльнасці, напрамкі навуковай і педагагічнай дзейнасці.

Можна без перабольшання канстатаваць, што ўсе аўтары нарысаў (прафесар А. Гужалоўскі, дацэнты А. Малюгін, А. Бурачонак, А. Максімчык, В. Яршова, С. Захаркевіч, В. Кахновіч, С. Цемушаў, В. Макарэвіч, А. Тарканеўскі, М. Шумейка, выкладчыкі А. Назаранка, І. Грыбко, Э. Маліноўская і інш.) выявілі такія цікавыя факты, якія прымушаюць па-новаму ўсведамляць веліч нашага ўніверсітэта, яго калектыву. У цэлым і стаіць задача выкарыстоўваць у апавяданні не толькі вядомы матэрыял, але і імкнуцца знайсці новы, у значнай ступені эксклюзіўны. Вядома, было б выдатна, калі б на ўсіх факультэтах вяліся ўласныя даследаванні. Бо шмат у чым толькі так можна максімальна дакладна ўзнавіць творчае жыццё чалавека і дзейнасць усяго ўніверсітэта!

Нядаўна ў нас прайшла канферэнцыя, прымеркаваная да 100-годдзя дэкрэта пра адкрыццё БДУ. Яна сабрала многіх сур'ёзных навукоўцаў розных спецыяльнасцяў. Напрыклад, фізікі прадставілі цікавыя сюжэты пра астранамічныя даследаванні ва ўніверсітэце. Але калі я спытаў, ці вядомае ім імя Арсенія Міхайлоўскага, то ў адказе прагучалі толькі агульныя ўяўленні.

Хоць Арсеній Аляксеевіч – родапачынальнік у Беларусі і выкладання, і правядзення даследаванняў у галіне астраноміі! Ён да нас «прывёз» астраномію! Па-за ўвагай на канферэнцыі застаўся і заснавальнік школы дзяржаўнага і канстытуцыйнага права Усевалад Дурдзянеўскі, хоць тэма «беларуская канстытуцыя» гучала. Ці яшчэ прыклады. У парку Горкага, куды я ўвесь час хаджу, нядаўна пастаўлены памятны знак, што тут у 20-я гады была прабурана свідравіна, якая дала Мінску мінеральную ваду. Непасрэднае дачыненне да гэтага мелі ўніверсітэцкія географы, у першую чаргу Мікалай Бліядуха. А наш выбітны хімік Міхаіл Паўлючэнка ў 50-я гады першым ацаніў магчымасці распрацоўкі Старобінскага радовішча калійных соляў і знайшоў рашэнне па эфектыўнай ачыстцы і вылучэнні сільвініту. Пра гэтых навукоўцаў трэба не толькі памятаць, але і голасна агучваць на ўсіх узроўнях іх заслугі, іх інтэлектуальную спадчыну. Бо нядобра, калі зараз у паўзабыцці апынуліся выбітныя матэматыкі Цэлестын Бурсцін, Уладзімір Дыдырка, Іосіф Пятосін, фізік Яфім Сіроцін, псіхолаг Серафім Васілейскі, хімік Эміль Змачынскі і многія іншыя, нарысы пра якіх мы ўжо апублікавалі ў дзвюх выдадзеных кнігах.

Гэтыя навукоўцы ўсведамлялі, што яны працуюць, ствараюць, рэалізуюць свае ідэі, рыхтуюць сабе змену ў Беларускім дзяржаўным універсітэце! Разумелі сваю гістарычную місію і ўсімі сіламі паднімалі інтэлектуальны ўзровень грамадства ўсёй краіны. Яны працавалі ў неймаверна складаных умовах (палітычных, эканамічных, маральных), але заўсёды заставаліся Навукоўцамі. Дарэчы будзе заўважыць, што менавіта навукоўцы БДУ стварылі і затым сваёй інтэлектуальнай працай увасаблялі шматлікія, асабліва навуковыя, установы рэспублікі – у першую чаргу Інстытут беларускай культуры, а затым Беларускую акадэмію навук. Яны вучылі студэнтаў, займаліся фундаментальнай і прыкладной навукай, рабілі велізарны ўнёсак у розныя сферы народнай гаспадаркі.

***– Хто браў удзел у падрыхтоўцы такога маштабнага выдання?***

– Гэта калектыўная праца, універсітэцкая. Кніга сабрала многіх нашых калегаў з іншых факультэтаў. Усе працавалі і працягваюць працаваць на належнае прадстаўленне імёнаў тых, дзякуючы каму мы амаль дасягнулі будучага, ужо такога блізкага 100-годдзя alma mater. Хацеў бы выказаць шчырыя словы падзякі супрацоўнікам і кіраўніцтву Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, усіх трох Фундаментальных бібліятэк Беларусі. Шмат у чым дзякуючы іх садзейнічанню ў пошуку дакументаў і самых розных матэрыялаў, іх капіраванні і сканіраванні стала магчымым стварыць нашу кнігу і займацца далейшай працай. Вялікі ўклад у рэалізацыю задуманага праекта ўнеслі спецыялісты ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ на чале з Н. М. Герасімовіч – рэдактары А. А. Лагвіновіч, А. В. Яфімаў і інш., мастацкі рэдактар Т. Ю. Таран, тэхнічны рэдактар Л. У. Жабароўская, карэктар Н. В. Яненка і іншыя (так, камп'ютарную вёрстку цудоўна выканала В. У. Гасюк). І аўтары, і выдаўцы паставіліся да зместу кніг, да герояў са шчырай пашанай і глыбокай удзячнасцю. А як кнігі будуць успрыняты чытачом, пакажа час.

**Гутарыў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**




# Курс на Scopus: навуковыя часопісы БДУ падаюцца ў міжнародную базу даных

У новым фармаце навуковыя часопісы ўніверсітэта выходзяць трэці год. Ужо ў маі перад міжнародным экспертным саветам Scopus паўстане наш першы «кандыдат» – «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя». Раскажам пра тое, як часопісы БДУ рыхтуюцца да ўваходжання ў сусветную навукова-інфармацыйную прастору.

### Прысутнасць у базах даных пашырае бачнасць часопісаў у міжнароднай навуковай супольнасці і падтрымлівае іх аўтарытэт

Сёння існуе праблема выбару часопіса для публікацыі, паколькі сярод навуковых выданняў сустракаецца шмат драпежніцкіх, ці, як іх яшчэ называюць, смецевых часопісаў, асноўная мэта якіх – зарабіць, таму аўтарам варта дбайна выбіраць выданні для публікацыі. Надзейней за ўсё звярнуцца да базы даных Scopus. У БДУ падрыхтоўка да падачы заяўкі ў Scopus вядзецца даўно. У 2016 г. упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы цалкам змяніла часопісы ў адпаведнасці з патрабаваннямі міжнародных навуковых баз даных: назвы, склад рэдкалегій, правілы падачы артыкулаў, афармленне матэрыялаў і бібліяграфічных спісаў і інш. З 2018 г. функцыянуюць сайты часопісаў і электронная рэдакцыя, якая ўключае ўсябе ўсю працу па адборы артыкулаў (у тым ліку рэцэнзаванне), падрыхтоўку іх да друку (літаратурнае рэдагаванне, апрацоўка ілюстрацый да матэрыялу, вёрстка, узгадненне з аўтарамі) і публікацыю на сайце. Таксама ў межах гэтай сістэмы вядзецца перапіска з аўтарамі. Такім чынам, электронная рэдакцыя спрашчае дакументазварот, сістэматызуе інфармацыю і гарантуе яе захаванасць. Паступова ўводзіцца двайное сляпое рэцэнзаванне, дзякуючы якому забяспечваецца якасны кантэнт. З 2019 г. артыкулам найбольш перспектыўных часопісаў надаецца DOI – ідэнтыфікацыйны нумар. Публікацыям у першых выпусках гэтага года («Часопіс БДУ. Хімія» і «Часопіс БДУ. Біялогія») DOI ўжо прысвоены.



### Галоўны крытэрый вызначэння прыярытэтных часопісаў – адпаведнасць міжнародным патрабаванням

Для падачы заяўкі ў Scopus вызначаны чатыры прыярытэтныя часопісы: «Часопіс БДУ. Гісторыя», «Часопіс БДУ. Геаграфія. Геалогія», «Часопіс БДУ. Матэматыка. Інфарматыка», «Часопіс БДУ. Фізіка». Менавіта яны на дадзены момант больш за ўсё адпавядаюць патрабаванням Scopus. Рэдкалегіі і ўпраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы ўжо завяршаюць работу па фарміраванні палітыкі часопісаў (інфармацыя пра адкліканне артыкула, адносіны рэдкалегіі да выпадкаў фальсіфікацыі і фабрыкацыі даных, самаплагіяту і самацытавання) і прывядзенні іх у адпаведнасць з патрабаваннямі міжнародных навуковых баз даных, такімі як геаграфічная разнастайнасць складу рэдкалегій і аўтараў (не толькі з краін СНД), наяўнасць профілю ў ORCID (ідэнтыфікацыйны нумар, які дазваляе прагледзець інфармацыю пра аўтара і яго публікацыі), актуальнасць інфармацыі на сайтах, высокі ўзровень англійскай мовы, адбор якасных навуковых даследаванняў, структураванне артыкулаў паводле сістэмы IMRAD (introduction, methods, results and discussion), дакладнасць бібліяграфічных спасылак. У межах падрыхтоўкі да ўваходжання ў Scopus пададзена заяўка на ўключэнне БДУ ў члены Асацыяцыі навуковых рэдактараў і выдаўцоў. Гэта падкрэслівае гатоўнасць універсітэта прытрымлівацца этычных прынцыпаў (згодна з рэкамендацыямі Міжнароднага Камітэта па публікацыйнай этыцы) пры падрыхтоўцы навуковых выданняў.

### Увайсці ў Scopus – мала, важна там утрымацца

Ацэнка часопіса праводзіцца ў два этапы: спачатку – расійскім экспертным саветам, а ў выпадку ўхвалення – асноўным экспертным саветам Scopus. У першую чаргу эксперты правяраюць часопіс на адпаведнасць фармальным крытэрыям: аналізуецца сайт, дзе ўся інфармацыя павінна быць актуальнай і прыводзіцца на дзвюх мовах – рускай і англійскай. Далей камісія ўважліва правярае выпускі часопісаў, якасць артыкулаў, іх адпаведнасць тэматыцы, цытаванасць.

– Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы правяло велізарную працу, каб вывучыць і выканаць патрабаванні міжнародных навуковых баз даных і ва ўзаемадзеянні з рэдкалегіямі павысіць узровень нашых выданняў. Дзякуючы такому плённаму супрацоўніцтву мы маем прыярытэтныя часопісы, якія сёлета падаюць заяўку ў Scopus, – дзеліцца начальнік УРВР ***Наталля Герасімовіч*** і адзначае: – На дадзены момант, паводле водгукаў аўтараў, рэдакцыйная работа ў часопісе адпавядае практыцы падрыхтоўкі артыкулаў у міжнародных рэйтынгавых часопісах.

**Падрыхтавала**
**Валерыя БАНДАРЧЫК**

УНІВЕРСІТЭТ
29 сакавіка 2019 года, № 5 (2211)

# Verba magistri. Як падрыхтаваць рэдкага спецыяліста?

**Свет хутка змяняецца, і таму студэнтаў трэба вучыць быць больш гнуткімі, мабільнымі і крэатыўнымі. Так лічыць чарговы герой нашага праекта «Новы погляд» Вольга ПРАКАПЧУК – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчыца кафедры класічнай філалогіі філалагічнага факультэта БДУ.**



*Загадчыца кафедры класічнай філалогіі Вольга Пракапчук са студэнткамі Антанінай Кунцэвіч, Арынай Лаўрыновіч, Крысцінай Сянько ў новым кабінеце грэчаскай філалогіі*

## «Класіка» і сучаснасць

У 15 гадоў Вольга Пракапчук прыехала з Гродна, каб паступіць у гісторыка-філалагічны клас Ліцэя БДУ. Атмасфера ліцэя ў значнай ступені паўплывала на яе светапогляд, выклікала жаданне паспрабаваць сябе ў навуцы. Чырвоны дыплом па заканчэнні філфака, тут жа магістратура, аспірантура і абарона ў тэрмін – усё атрымлівалася лёгка і нязмушана, таму што побач заўсёды былі неверагодныя настаўнікі, а ў душы – прага да новых ведаў. Вольга Генрыхаўна мяркуе, што дзякуючы ўніверсітэту ёй удалося знайсці сваё сапраўднае прызначэнне.

– Выразна памятаю, як на першым сходзе ў Ліцэі БДУ нам сказалі: «Вы будучая інтэлектуальная эліта Беларусі». Гэтыя словы запалі ў душу, увесь час служылі стымулам да самаразвіцця, – успамінае Вольга Генрыхаўна. – Патрапіўшы ў БДУ, не захацела адсюль сыходзіць. Калі паступала на філалагічны факультэт, абрала новую, перспектыўную спецыяльнасць: гэта быў першы набор на класічную філалогію. У савецкі час філолагаў-класікаў – спецыялістаў па лацінскай і старажытнагрэчаскай мовах і антычнай літаратуры – рыхтавалі толькі ў Маскве, Ленінградзе, Львове і Тбілісі. Пазней, ужо ў часы незалежнай Беларусі, з'явілася неабходнасць ва ўласных кадрах. Пасля аспірантуры засталася працаваць на роднай кафедры.

Велізарным поспехам Вольга Генрыхаўна лічыць тое, што лёс звёў яе з унікальнымі людзьмі, якія сталі для яе настаўнікамі. Сярод іх – Антаніна Васільеўна Гарнік, Ніна Барысаўна Мячкоўская, Андрэй Зіноўевіч Цісык і, вядома ж, Галіна Іванаўна Шаўчэнка, якая заснавала і больш за 20 гадоў узначальвала кафедру класічнай філалогіі. Змяніўшы ў 2017 г. Галіну Іванаўну на пасадзе загадчыцы, Вольга Пракапчук адкліакецца пра яе як пра сапраўднага прафесіянала, эрудыта і бліскучага педагога:

– Яна ставілася да нас як маці, укладвала ў студэнтаў сілы і душу. Мы таксама імкнёмся надаваць нашым студэнтам-класікам шмат увагі. Бо ў нас складаная спецыяльнасць, можна сказаць, вышэйшы пілатаж у філалогіі. Патрэбныя моцныя лінгвістычныя здольнасці, развітая логіка, уседлівасць, уменне бачыць сувязь паміж класічнай старажытнасцю і сучаснасцю.

Кафедра з'яўляецца выпускаючай па спецыяльнасці «Класічная філалогія». Набор студэнтаў – раз у 4 гады. Гэта будучыя выкладчыкі лацінскай, старажытнагрэчаскай мовы і антычнай літаратуры. Спецыялісты рэдкія і ўнікальныя. Быць больш запатрабаванымі на рынку працы ім дапамагаюць веды новагрэчаскай і англійскай.

– Нашы выпускнікі ідуць выкладаць на гуманітарныя факультэты вядучых навучальных устаноў краіны, у медыцынскія ўніверсітэты, каледжы. Таксама яны працуюць у аддзелах рэдкіх кніг Нацыянальнай бібліятэкі, Навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, у Нацыянальным архіве, г. зн. там, дзе патрэбныя спецыялісты па рэдкіх у наш час лацінскай і старажытнагрэчаскай мовах.

Супрацоўнікі кафедры выкладаюць не толькі студэнтам спецыяльнасці «Класічная філалогія». Лацінская і старажытнагрэчаская мовы вывучаюцца на такіх факультэтах, як філалагічны, гістарычны, юрыдычны, хімічны, біялагічны, ФФСН, ФСК, ФМА. Вольга Генрыхаўна робіць акцэнт на тым, што латынь з'яўляецца тым падмуркам у падрыхтоўцы спецыяліста, які дапамагае прафесійна валодаць навуковай тэрміналогіяй у сваёй галіне ведаў, глыбей разумець родную і замежныя мовы.

**Латынь з'яўляецца тым падмуркам у падрыхтоўцы спецыяліста, які дапамагае прафесійна валодаць навуковай тэрміналогіяй у сваёй галіне ведаў, глыбей разумець родную і замежныя мовы.**

## Ад малой радзімы да сусветнай арэны

Па меркаванні загадчыцы кафедры, адной з найважнейшых мэт у арганізацыі навучальнага працэсу стала падрыхтоўка канкурэнтаздольных спецыялістаў, якія могуць творча падыходзіць да рашэння розных задач. Таму на кафедры студэнтам прапануюць чаргаваць звыклыя лекцыі і практычныя заняткі з крэатыўнымі конкурсамі, стажыроўкамі, праграмамі, якія развіваюць у маладых людзях неабходныя якасці. Напрыклад, з мэтай развіцця асобы студэнта, актывізацыі яго творчага мыслення кафедра штогод праводзіць агульнаўніверсітэцкі конкурс творчых прац «Культурная спадчына антычнасці і сучаснасць». Ёсць шэраг іншых значных студэнцкіх праектаў.

– Да года малой радзімы нашы студэнты працавалі над даследчым праектам «Лацінамоўныя надпісы ў храмах Беларусі». Яны тры месяцы збіралі і перакладалі надпісы ў храмах Мінска і абласных цэнтраў. Вынікі працы былі сабраны на выставе, якую можна ўбачыць на факультэце. Надпісы ў экспазіцыі суправаджаюцца перакладам і навуковым апісаннем. Так нашы студэнты далучыліся да вывучэння лацінамоўнай спадчыны нашай краіны, – распавядае Вольга Генрыхаўна пра студэнцкі практыка-арыентаваны адукацыйны праект. – У планах вывучыць касцёлы раённых цэнтраў і вёсак. Таксама кафедра супрацоўнічае з Нацыянальным гістарычным музеем, дзе мы плануем ажыццявіць пераклад з латыні надпісаў на экспанатах, даць іх навуковае апісанне. Працуем над перакладам карт перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Кафедра падтрымлівае міжнародныя кантакты з падраздзяленнямі адпаведнага ці сумежнага профілю ўніверсітэтаў Грэцыі, Польшчы, Украіны, Расіі. Так, кафедра супрацоўнічае з факультэтам Artes Liberales Варшаўскага ўніверсітэта ў праекце, тэмай якога стала ўспрыманне класічнай старажытнасці ў дзіцячай і юнацкай культуры. На міжнароднай канферэнцыі, якая праводзіцца ў рамках праекта, удзельнікі прадставілі англамоўныя даклады і тэматычныя плакаты, прысвечаныя вобразам персанажаў старажытнагрэчаскай міфалогіі ў сучаснай культуры. Акрамя гэтага, у рамках працы з гэтым жа ўніверсітэтам студэнты-класікі знялі навучальны фільм на англійскай мове «Myths Around Us». У роліку прадэманстравалі, якія памылкі робяцца пры выбары для фірмаў і гандлёвых марак назваў, заснаваных на міфах.

– 22 сакавіка прынялі ўдзел у міжнародным лёнскім лацінa-грэчаскім фэсце. Для папулярызацыі антычнай культуры французы прапанавалі штогод па ўсім свеце ў адзін і той жа час чытаць антычных аўтараў. Сёлета ўсе захопленыя чыталі «Іліяду» Гамера. Наша кафедра праводзіла адкрытую лекцыю па гэтым аўтару, чыталі твор на старажытнагрэчаскай і беларускай мовах. А ў якасці слухачоў на мерапрыемства запрасілі вучняў СШ № 66 Мінска. Відэа нашай працы выклалі на сайце фестывалю, – кажа загадчыца кафедры.

## Новыя гарызонты

Сёння, калі змяняецца сама структура адукацыі, студэнты могуць атрымаць веды не толькі ў аўдыторыі. Вольга Генрыхаўна працягвае:

– Мы выкарыстоўваем дыстанцыйныя тэхналогіі адукацыйнага партала філалагічнага факультэта БДУ, матэрыялы сайта кафедры. Эфектыўнай падрыхтоўцы спецыялістаў, аптымізацыі дзейнасці па распрацоўцы новых формаў навучальна-даследчай працы студэнтаў і кантролю за самастойнай працай студэнтаў будзе спрыяць адкрыццё кабінета грэчаскай філалогіі пры кафедры. Кабінет створаны пры спонсарскай падтрымцы Ганаровага консульства Грэцыі ў Рэспубліцы Беларусь і асабістым актыўным садзейнічанні ганаровага консула Грэцыі Паўла Тапузідзіса. На базе кабінета плануецца правядзенне розных адукацыйных, навуковых і культурных мерапрыемстваў, рэалізацыя даследчых праектаў. Стварэнне кабінета таксама паспрыяе ўмацаванню культурных і навуковых сувязяў паміж Грэцыяй і Беларуссю, актывізацыі навуковых кантактаў у акадэмічнай супольнасці нашых краін.

Вольга Пракапчук падкрэслівае, што вельмі важна раскрыць у студэнтах іх патэнцыял, паказаць ім новыя гарызонты. Выкладчыкі павінны імкнуцца да таго, каб развіваць у студэнтах крытычнае мысленне, творчыя здольнасці, адаптацыйныя навыкі, прапануючы ім інавацыйныя даследчыя і практыка-арыентаваныя праекты. Гэта дапаможа маладым людзям не губляцца ў шматмерным свеце, быць канкурэнтаздольнымі і мабільнымі.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

# «Забрала дакументы, але вярнулася, таму што падабаецца і вучоба, і горад»

## Двойчы студэнтка БДУ з Казахстана

**У Алене ДРАЦЕНКА не адразу пазнаеш іншаземку. 21-гадовая студэнтка факультэта філасофіі і сацыяльных навук прыехала вучыцца ў БДУ з Казахстана. Сваёй прафесіяй дзяўчына абрала медыцынскую псіхалогію і цяпер заканчвае трэці курс. Газета «Універсітэт» распытала Алену пра прафесію і жыццё ў Беларусі і, вядома, вучобу ў БДУ.**



Па сям'і Алены Драценка можна вывучаць гісторыю: руская бабуля і дзядуля паехалі на асваенне цаліны ў Казахстан, дзе нарадзіліся яе бацькі. У Паўладары, горадзе на мяжы з Расіяй, Лена правяла сваё дзяцінства і школьныя гады. Цікава, што горад па памерах нават большы за Мінск, а вось жыве там усяго трыста тысяч. «Пасля Мінска нязвыкла – на вуліцах вельмі пуста», – усміхаецца дзяўчына. Цяпер яе сям'я пераехала ў Расію.

### «Хачу ўзаемадзейнічаць з людзьмі»

З 9 класа Алена вырашыла, што хоча ўзаемадзейнічаць з людзьмі. Дзяўчыну цікавіла арганізацыя добраахвотніцкіх праектаў, ад школы яна ездзіла ў дзіцячыя дамы, дапамагала рабіць хатнія заданні, прывозіла адзенне. Так Алена прыйшла да «спрыяючай прафесіі» псіхолага: «Стала цікава, што ў людзей у галаве, што ў мяне, хацелася дапамагаць людзям». Цяпер ва ўніверсітэце студэнтка арганізоўвае факультэцкія мерапрыемствы.

«У Казахстане шмат абітурыентаў з'язджаюць, каб атрымаць замежную адукацыю. Едуць у Кітай ці Чэхію, да таго ж, каб паступіць за мяжу, не трэба добра вучыцца – на платнае можна паступіць і з невысокімі баламі. Я прапусціла падачу дакументаў, паўстаў выбар паміж навучаннем у Расіі ці Беларусі. У апошняй ніколі не была, а першую даволі добра вывучыла, таму вырашыла паступіць у Беларусь», – распавядае дзяўчына.

Па словах Лены, у Беларусі захавалася добрая псіхалагічная школа яшчэ з савецкіх часоў, магутны прафесарскі склад. «У Казахстане пра псіхалогію наогул не кажуць, гэта прафесія непрэстыжная – трэба нафту пампаваць і ўсё такое», – наракае студэнтка.




*Сярод арганізатараў псіхалагічнага квесту «Cherchez la femme»*



*Падчас студэнцкай акцыі па барацьбе са СНІДам*

### Псіхіятр бачыць больш хваробу, а псіхолаг – асобу

«Перад першым курсам задумалася пра сацкам, але ў іх шырокая праграма, а я хацела вузкую спецыяльнасць. Узаемадзейнічаць не з натоўпам, а менавіта з чалавекам. І абрала медыцынскую псіхалогію, акрамя паталогій яна вывучае сацыяльнае ўзаемадзеянне ў групе, чалавека як асобу», – тлумачыць Алена.

Медыцынскія псіхолагі працуюць у псіхіятрычных аддзяленнях, а прайшоўшы дадатковае навучанне, у Расіі могуць займацца і псіхатэрапіяй. У Беларусі так нельга, усё-такі псіхатэрапеўт – гэта ўрач з медыцынскай адукацыяй. Аднак у Лены няма мэты з часам «перапрафіліравацца»: «Я не магу сказаць, што хачу займацца тэрапіяй. Вось псіхакарэкцыяй і псіхадыягностыкай – так. Тэрапія – накіраванае доўгае лячэнне, праца з праблемай, а карэкцыя існуе ў рамках дыягностыкі, напрыклад, у паліклініцы. Людзі прыходзяць да псіхіятра, а ён накіроўвае іх да медыцынскіх псіхолагаў праверыць памяць, мысленне, правесці гутарку. Ёсць выразны падзел норма–паталогія». Адказнасць у выстаўленні дыягназу больш ляжыць на псіхіятру, а мы як памочнікі. Мы не можам прапісаць лекі, але можам сумесна з урачом скласці немедыкаментознае лячэнне. Псіхіятр бачыць больш хваробу, а псіхолаг – асобу, разглядае больш з чалавечай пазіцыі.

Першыя курсы студэнты вывучаюць агульную псіхалогію, а затым падзяляюцца па спецыялізацыях. «Спачатку я хацела ісці на сацыяльную псіхалогію, хваробы мяне палохалі, але цяпер заўважаю, што гляджу на іх з цікавасцю. На практыцы ў дыспансерах аднагрупнікі могуць уціснуцца ў канапы, калі прыходзіць пацыент, а мне цікава. Адзін раз сама праводзіла дыягностыку ў інтэрнаце для разумова адсталых дзяцей. Не магу вызначыцца, з кім цікавей працаваць – з дарослымі ці дзецьмі. З дзецьмі лягчэй, яны не скажуць: «Хто ты такая? Маладая, а ўжо прыйшла мяне лячыць».

### Як павысіць псіхалагічную культуру

Калі чалавек звяртаецца да псіхолага і псіхіятра, гэта не значыць, што ён хворы і на ім трэба паставіць крыж. Гэта больш гутарка, гэта адэкватна і карысна. «Мая мама-педагог часта сутыкаецца з гэтым стэрэатыпам. Калі бацькам гіперактыўных дзяцей раіць звярнуцца да псіхолага, у адказ чуе рэзкае: «Вы што, маё дзіця псіхам лічыце?» Вядома, не, гэта проста кансультацыя са спецыялістам, які дапаможа накіраваць энергію дзіцяці ў станоўчае рэчышча. Бо многія бацькі пачынаюць ціснуць на залішне актыўнае дзіця, што няправільна. Думаю, змяніць меркаванне грамадства дапамогуць публічныя выступленні накшталт TED Talks», – прапануе дзяўчына.

Лена кажа, што, даведаўшыся пра яе спецыяльнасць, людзі часта просяць яе апісаць іх характар ці нават адгадаць, пра што яны думаюць. Аднак дзяўчына ўсё зводзіць на жарт – бо мець зносіны хочацца як чалавек з чалавекам! Нягледзячы ні на што, Алена не хавае сваю будучую прафесію, наадварот, кажа пра яе з гонарам – гэта ж так цікава!

**Візітоўка**

- Лена – староста і куратар першакурснікаў, арганізатар мерапрыемства» Студэнт БДУ на тыдзень» на факультэце.
- Калі здараецца штосьці дрэннае, Лене сніцца такая прыгожая музыка, што яна прачынаецца з вельмі добрым настроем.
- Улюбёная кніга – «Кветкі для Элджэрона» Дэніэла Кіза.

### Адлічэнне і вяртанне

На першым курсе Лена вельмі сумавала па доме, было цяжка, а суседкі ў інтэрнаце толькі падлівалі масла ў агонь: казалі, што вучыцца будзе толькі цяжэй, часта адлічваюць. Бракавала і сонца. І, хоць падабалася і вучоба, і горад, дзяўчына забрала дакументы.

Першыя два месяцы дома Лена спрабавала вучыцца: адкрывала падручнікі, пісала канспекты, але зразумела, што хатняе навучанне не яе. Неабходнае ўзаемадзеянне з выкладчыкамі. Восем месяцаў дзяўчына прапрацавала ў краме спартыўнага адзення, кожны дзень праз яе праходзіла па сто чалавек, гэта дапамагло ёй стаць нашмат больш праніклівай. «У студзені я думала паступаць у сябе ці ў Расіі на другі семестр. Але бліжэй да паступлення я разумела, што хачу вярнуцца, бацькі мяне падтрымалі, і я аднавілася на другі курс.

У новай групе ў Лены з'явілася найлепшая сяброўка – Вераніка з Арменіі.

### На псіхолага вучацца, каб разабрацца ў сабе

«Наш факультэт – гэта канцэнтрацыя філасофаў, псіхолагаў, усё гэта так глыбока і за межамі, што бывае цяжкавата. Да кожнага трэба знайсці падыход і ведаць асаблівасці. Кажуць, што проста так на псіхолага вучыцца не прыходзяць – гэта праўда! Мы часта гэта абмяркоўваем з выкладчыкамі: вучацца, каб разабрацца ў першую чаргу ў сабе».

Самыя цікавыя і актыўныя пары, па меркаванні Лены, праходзяць з выкладчыкам Ігарам Хонскім. Гумар – тэма яго дыплома, напэўна, таму на яго парах заўсёды весела.

Аднойчы Лене прыйшлося ўзгадаць усё, чаму вучылі на факультэце: «У маёй малодшай сястры на атракцыёнах рэзка пачалася паніка, задышка, плач, а мы на вышыні, нічога зрабіць нельга. І я пачала з ёй размаўляць, супакойваць, дыхаць, як нас вучылі, сцішыла яе».

### Зялёны колер Беларусі

Мне падабаюцца нацыянальныя святы і дні культур. У Беларусі сапраўды захавалася культура, і гэтаму надаецца шмат увагі, у той час як у Казахстане больш зважаюць на развіццё тэхналогій. Часта бачу дзяцей і моладзь, якія размаўляюць на беларускай, гэта вельмі цікавая мова. У Мінску Лена стала ярчэй апранацца і пафарбавала валасы ў фіялетавы – тут да гэтага добра ставяцца, а ў Казахстане не разумеюць.

«Тут вельмі хораша, я ўбачыла расліны, якія ў жыцці не бачыла ў Казахстане! У нас адны стэпы, таполі, карагачы (вязы). Тут я іду – дубы, каштаны, качкі плаваюць, усё жывое. А з самалёта ўсё зялёнае», – захапляецца дзяўчына.

Але ёсць тое, што Лену здзіўляе: «У Казахстане мы пачынаем працаваць яшчэ школьнікамі, маладыя пасля школы ўжо на ўсю моц будуюць бізнес-планы, людзі больш актыўныя. А тут нават пасля выпуску з універсітэта моладзь можа трымацца за мамчыну спадніцу».

Студэнтка прызнаецца, што зараз у яе ёсць жаданне пажыць у розных краінах. Напрыклад, паступіць у магістратуру за мяжой ці вывучаць дадатковыя тэрапіі.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 сакавіка 2019 года, № 5 (2211)







# Да старту гатовыя!

## 1700 студэнтаў БДУ – валанцёры II Еўрапейскіх гульняў

Да галоўнай падзеі 2019 года – II Еўрапейскіх гульняў – менш за 100 дзён. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт не толькі іх афіцыйны партнёр, але і адзін з універсітэтаў, чыіх студэнтаў будзе больш за ўсё ў якасці валанцёраў: з 8000 добраахвотнікаў, якія будуць задзейнічаны ў Гульнях, 1700 – студэнты БДУ. Як праводзіцца праца з валанцёрамі, якія факультэты самыя актыўныя і што атрымлівае студэнт, распавёў **Рыгор ПАСРЭДНІК,** намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце студэнцкага гарадка і кіраўнік цэнтра падрыхтоўкі валанцёраў II Еўрапейскіх гульняў у БДУ.

### Гульні і БДУ

«II Еўрапейскія гульні – важнае іміджавае мерапрыемства. Паляпшаецца інвестыцыйны клімат, раскрываецца турыстычны патэнцыял Беларусі. Для БДУ вялікі гонар быць партнёрам Гульняў і прадстаўляць краіну на гэтым буйным мерапрыемстве. Маштаб па колькасці відаў спорту і колькасці ўдзельнікаў параўнальны з Зімовымі Алімпійскімі гульнямі ў карэйскім Пхёнчхане 2018 года», – каментуе Рыгор.

Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт улетку мінулага года падпісалі дамову пра супрацоўніцтва, якое прадугледжвае партнёрскія адносіны, накіраваныя на захаванне і прымнажэнне адукацыйнай і гуманітарнай спадчыны, прасоўванне будучага мультыспартыўнага форуму і распаўсюджанне інфармацыі пра яго ў спартыўных арганізацыях Рэспублікі Беларусь і ўсяго свету.

Пытаннямі валанцёрства ў БДУ займаецца цэнтр падрыхтоўкі валанцёраў II Еўрапейскіх гульняў БДУ. Галоўная яго задача – арганізаваць удзел валанцёраў з ліку студэнтаў універсітэта ў Гульнях у чэрвені гэтага года, а таксама суправаджаць студэнтаў на ўсім шляху: з моманту іх рэгістрацыі ў сістэме на сайце *minsk2019.by*, на ўсіх этапах навучання, да завяршэння спаборніцтваў. «У цэнтр уваходзяць наместнікі дэканаў, лідары моладзевых арганізацый, прадстаўнікі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, студгарадка», – тлумачыць Рыгор Пасрэднік. Курыруе падрыхтоўку да Гульняў прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Іван Янушэвіч.

У студэнтаў ёсць пытанні пра валанцёрства, на самыя частыя з іх адказаў кіраўнік цэнтра Рыгор Пасрэднік.

### Як становяцца валанцёрамі?

– Напачатку неабходна зарэгістравацца на сайце *minsk2019.by*, завесці там асабісты кабінет (у далейшым асабісты кабінет стане для валанцёраў галоўным сродкам зносін падчас Гульняў – там будуць размяшчацца навучальныя матэрыялы, прызначацца пазіцыі і працоўныя змены, асабісты кабінет з моманту рэгістрацыі трэба правяраць штодня, каб не прапусціць важную інфармацыю), прайсці сумоўе на англійскай мове, выканаць тэставыя заданні, прайсці агульныя, функцыянальныя і аб'ектавыя трэнінгі. Нягледзячы на няпросты шлях да валанцёрства, на дадзены момант звыш 1700 студэнтаў выявілі жаданне стаць валанцёрамі. Першапачаткова заявак было больш, але частка людзей, чый узровень замежнай мовы, узровень асабістай матывацыі быў недастатковы для ўдзелу ў Гульнях, адсеяліся на раннім этапе. Выдатныя веды англійскай мовы (афіцыйнай мовы міжнароднага турніру), веды іншых еўрапейскіх моў, наяўнасць добраахвотніцкага досведу павышаюць рэйтынг будучага валанцёра, што ў далейшым адаб'ецца на прапанаваных пазіцыях і функцыянальных кірунках.

### Ці абавязкова ведаць англійскую мову?

– Веданне англійскай мовы вітаецца. На большасць ключавых пазіцый, дзе прадугледжваецца ўзаемадзеянне з замежнымі грамадзянамі (афіцыйнымі асобамі дэлегацый, спартсменамі і г. д.), будуць адбірацца валанцёры, якія валодаюць замежнай моваю на добрым узроўні. У той жа час ёсць і такія кірункі добраахвотніцкай працы, дзе веды замежнай мовы на высокім узроўні не патрабуюцца (напрыклад, «сэрвісы для гледачоў» і інш.)

### Што такое функцыянальныя кірункі і якія яны бываюць?

– Функцыянальны кірунак – гэта спосаб выявіць сябе ў рамках Гульняў. Функцыянальны кірунак вызначае спіс задач, якія студэнты будуць выконваць у якасці валанцёраў. Акрэдытацыя, лінгвістычныя паслугі, камунікацыі, допінг-кантроль, узаемадзеянне са СМІ, асістэнты НАК, кіраванне аб'ектамі, транспарт, пратакол і інш. Валанцёры могуць абраць адзін ці некалькі кірункаў з 20. Канчатковая пазіцыя ім будзе прызначана пасля праходжання асноўных тэстаў.

### Навучанне валанцёраў

Для валанцёраў праводзяцца спецыяльныя падрыхтоўча-навучальныя трэнінгі. Гэта камандаўтваральныя гульні, функцыянальныя трэнінгі па спецыялізацыях і аб'ектавыя, яны пачнуцца пасля размеркавання валанцёраў па пазіцыях. На аб'ектавых трэнінгах валанцёры, якія прымацаваны да якога-небудзь спартыўнага аб'екта, напрыклад, да «Мінск-Арэны», вывучаюць яго ўздоўж і папярок, каб выдатна арыентавацца падчас мерапрыемстваў. Серыя агульных трэнінгаў прайшла на базе ўніверсітэта ў лютым для студэнтаў БДУ і іншых ВНУ Мінска.

### Чаму студэнты становяцца валанцёрамі?

Перш за ўсё гэта ўнутраная матывацыя, жаданне далучыцца да выдатнай маштабнай падзеі міжнароднага ўзроўню, завесці новыя знаёмствы, атрымаць каласальны арганізацыйны досвед, выдатную моўную і камунікатыўную практыку (што асабліва актуальна для студэнтаў факультэта міжнародных адносін, Інстытута бізнесу, факультэта сацыякультурных камунікацый – ад студэнтаў гэтых факультэтаў і паступіла больш за ўсё заявак). Акрэдытацыя ў якасці валанцёра дазваляе падчас гульняў карыстацца грамадскім транспартам бясплатна, будзе арганізавана бясплатнае харчаванне падчас змен, прапанаваны набор спецыяльнай экіпіроўкі: вятроўка, шорты, пола, куртка, красоўкі. Акрамя гэтага ўніверсітэт, ідучы насустрач студэнтам, якія выявілі жаданне стаць валанцёрамі, дазволіць здаваць сесіі і праходзіць практыкі па індывідуальным графіку.

Валанцёрства – гэта яшчэ і велізарны прафесійны досвед, які дапаможа пры працаўладкаванні. Выпускнікі БДУ, якія былі валанцёрамі на Чэмпіянаце свету па хакеі ў 2014 г., сёння супрацоўнікі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 г.». Валанцёрства – гэта таксама магчымасць падарожнічаць. Падчас падрыхтоўкі валанцёры ўдзельнічаюць у так званых тэставых мерапрыемствах. Такімі былі, напрыклад, адкрыты чэмпіянат Еўропы па біятлоне, міжнародны турнір па самба на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, улетку мінулага года некаторыя нашы студэнты бралі ўдзел у якасці валанцёраў у Чэмпіянаце свету па футболе. «Мэта заключалася ў тым, каб валанцёры атрымалі досвед на такім маштабным мерапрыемстве, а праз год змаглі ім падзяліцца і плённа працаваць на II Еўрапейскіх гульнях, – тлумачыць ***Багдан Пятрашка***, студэнт 4 курса ФМА. – Мне прапанавалі 3 гарады: Маскву, Казань, Санкт-Пецярбург. Нядоўга думаючы, я абраў Санкт-Пецярбург, бо ў Маскве я быў, а пра Пецярбург марыў. Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў забяспечвала пражыванне, харчаванне, праезд, таксама прадстаўнікі дырэкцыі прыязджалі да нас, глядзелі, як працуюць валанцёры, ці карысны гэта досвед. Я ўжо чакаю ўсіх на II Еўрапейскіх гульні, думаю, куды звадзіць, што паказаць у Мінску».

### «Bright Fest BSU. Па дарозе да II Еўрапейскіх гульняў!»

11 мая БДУ сумесна з фондам «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» арганізуе фэст актыўнага ладу жыцця і творчасці «Bright Fest BSU. Па дарозе да II Еўрапейскіх гульняў!», які пройдзе на сталічным стадыёне «Дынама». На галоўнай сцэне фэсту выступяць гурты «J:МОРС», «Ляпіс-98». Пазней абвесцяць яшчэ двух зорных хэдлайнераў. На двух сцэнах пройдуць выступленні творчых калектываў і салістаў БДУ, моладзевых калектываў, кавер-бэндаў і артыстаў эстрады Беларусі. Студэнцкі моладзевы фэст прысвечаны падрыхтоўцы да Гульняў, валанцёрству, актыўнаму ладу жыцця, спорту і творчасці.

На фэсце будзе арганізавана праца інтэрактыўных пляцовак моладзевых арганізацый універсітэта, прадстаўлены моладзевыя субкультуры, творчыя моладзевыя праекты, арганізаваны спартыўныя і творчыя змаганні, песенныя і танцавальныя батлы, зоны актыўнага адпачынку і рэлаксацыі, конкурсы, фотазоны і шматлікае іншае. Запланаваны сустрэчы з беларускімі зоркамі спорту.

Удзел у фэсце для валанцёраў Гульняў бясплатны, для студэнтаў-неваланцёраў будзе зніжка.

**Надзея МАРХЕЛЬ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

29 сакавіка 2019 года
Падпісана да друку 27.03.2019 г.
Зак. 128. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*